*Калечыц І.Л., вядучы навуковы супрацоўнік
цэнтра гісторыі навукі і архіўнай справы
Інстытута гісторыі НАН Беларусі,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт*

## "Луча солнечьнаа, просветившия землю Полотьскую": асоба прападобнай Еўфрасінні

Распавядаць пра гістарычную асобу з сучаснага пункта гледжання – гэта заўсёды складана. Вялізарны інфармацыйны разрыў існуе паміж нашым часам і XII стагоддзем. Але зразумела, што чалавек застаецца чалавекам ва ўсе часы...

Еўфрасіння Полацкая – асоба, якая апярэдзіла свой час, але ў які б час яна не нарадзілася, яна была б яскравай і неардынарнай. Паспрабуем разгледзіць шлях гэтай незвычайнай жанчыны.



**Літаграфія іконы прападобнай Еўфрасінні Полацкай.**
XIX – пачатак XX ст.

Калі казаць сучаснай мовай, гэта была дзяўчына з "вялікімі стартавымі магчымасцямі": прыгожая князёўна з добрым выхаваннем, якая атрымала добрае навучанне і мела вялікую схільнасць да "кніжнай навукі": "па ўсіх гарадах разышлася слава пра яе мудрасць і добрыя здольнасці да навук, і красу цялесную"[1].

У невялікім, па нашых мерках, узросце перад ёй паўстаў выбар, два шляхі: першы, традыцыйны і больш прывабны для жанчын таго часу, – замужжа, другі, цяжкі і складаны, – манаства. Першы меркаваў дастатак і долю пры жыцці, але бязвеснасць у часе: "жыццё іх праплыло і загінула іхняя слава, быццам прах, горай за павуцінне"[2].

---

[1] Кніга жыцій і хаджэнняў: Пер. са старажытнарус., старабеларус. і польск. / Уклад., прад. і каментарыі А. Мельнікава. – Мн.: Маст. літ., 1994. – с. 44
[2] Там жа.

Другі шлях – самастойнасць, магчымасць распараджацца сабой і вечнасць: “тых памятаюць на зямлі, іх імёны напісаныя на нябёсах”[3].

Прападобная абірае другі шлях, але якім чынам. Яна пачынае “з нізоў”, не як асоба княжацкага роду, перад якой адчынены ўсе дзверы: пострыг – простае манаскае жыццё – цяжкая праца перапісвання кніг у галбцы полацкай Сафіі.

Праз выпрабаванні даецца ёй наступная ступень – ігуменства і тут ужо ў поўнай меры раскрываюцца яе адукаванасць і розум, арганізатарскія і выхаваўчыя таленты, узведзеныя ў дасканаласць.

Нават адной са спраў, якія яна здзяйсняла, хапіла б чалавеку, каб праславіцца ў стагоддзях. Гэта перапісванне кніг – нежаночая цяжкая праца, якая ажыццяўлялася вельмі марудна, устаўным пісьмом, па 1,5 старонкі ў дзень. Пісьмо, якое больш нагадвала рысаванне, ажыццяўлялася седзячы. Адно калена было паднята, на ім ляжала рука, а на ёй – пергамен, на які наносіліся літары. Або можна было пісаць на прыладзе, якая нагадвала пюпітр. Маргіналіі ў сярэдневяковых кнігах захавалі скаргі пісцоў на цяжкую працу, галаўны боль і боль у вачах.



**Кцітарская фрэска.**
Паўднёвая сцяна заходняга рукава паўднёвага кампартымента полацкай Спаса-Праабражэнскай царквы



**Выява евангеліста Матфея – прыклад палажэння пісца падчас перапісвання кніг.**
Ветразь полацкай Спаса-Праабражэнскай царквы

[3] Там жа.



**Полацкі Спаса-Праабражэнскі (першапачаткова, Спасаўскі) храм**

Прападобная Еўфрасіння – ініцыятар будаўніцтва храмаў, Спасаўскага і Багародзіцкага. Гэта меркавала атрыманне дастатковых сродкаў і арганізацыю будаўніцтва: запрашэнне майстроў, будаўнікоў і фрэскістаў. Натуральна, яна назірала за будоўляй і была ў курсе таго, як яна ажыццяўляецца, а у гэты працэс уваходзіць, напрыклад, не толькі мясцовая вытворчасць цэглы, але і дастаўка вялікай колькасці мінералаў для вытворчасці фарбаў фрэскавага жывапісу, большасць з якіх, такія як азурыт, лазурыт, малахіт і іншыя, не сустракаюцца на тэрыторыі Беларусі, а фарбамі, утворанымі з іх, намалявана больш за 1000 кв м фрэсак.

Пасля будаўніцтва яна змясціла ў храмах святыні: каштоўны крыж – вяршыню ювелірнай вытворчасці – і ікону Багародзіцы Адзігітрыі, атрыманай з Канстантынопаля.




**Крыж, зроблены майстрам Лазарам Богшам для прападобнай Еўфрасінні**

Фрэскавы роспіс Спаса-Праабражэнскага храма, які захаваўся да нашага часу і быў адкрыты ў ходзе рэстаўрацыйных работ, дэманструе, што прападобная Еўфрасіння, безумоўна, абапіралася на традыцыйнасць праграмы роспісу храмаў, па якіх змяшчэнне пэўных сюжэтаў у пэўных месцах было абавязковым, але дадала ў роспіс сюжэты, якія брала з богаслужэбнай літаратуры. Такім чынам яна не толькі ўвяла свет “кніжнасці” у роспіс царквы[4], але і зрабіла яго моцным выхаваўчым сродкам, даступным простым людзям.



**Інтэр’ер полацкага Спаса-Праабражэнскага храма**

[4] Сарабьянов, В. Д. Мир книжности в росписях Спасской церкви Евфросиньевского монастыря / В. Д. Сарабьянов // Выступление Сарабьянова Владимира Дмитриевича, кандидата искусствоведения, главного искусствоведа, бригадира художников-реставраторов Межобластного научно-реставрационного художественного управления (г. Москва) с докладом «Мир книжности в росписях Спасской церкви Евфросиньевского монастыря. К вопросу о просветительской деятельности преп. Евфросинии Полоцкой» на конференции «История и археология Полоцка и Полоцкой земли» 1-3 ноября 2012 г. [Электронный ресурс] – Режим доступа: https://www.youtube.com/watch?v= MI0t8jcqA3c. – Дата доступа: 02.04.2024



**Прападобны Яфрэм Сірын са скруткам павучальнага тэкста ў руках**

Усе фрэскавыя кампазіцыі Спаса-Праабражэнскага храма суправаджаюцца надпісамі, а “у зоне даступнасці” у наосе святыя трымаюць у руках скруткі з тэкстамі. Гэтыя тэксты праслаўляюць манаскае жыццё з яго складанасцямі і ўзнагародамі і даюць магчымасць усім пісьменным людзям азнаёміцца з прамудрасцю. Мы лічым, што тэксты на скрутках, як і амаль усе астатнія суправаджальныя надпісы царквы, пісала сама прападобная Еўфрасіння ў працэсе роспісу храма фрэскамі. Тэксты былі выкананы па памяці ўпэўненай рукой прафесіянальнага пісца ў кароткі час, адведзены ад нанясення фарбы на сцену да яе высыхання[5].

Мы можам сцвярджаць, што прападобная здзяйсняла подзвіг стоўпніцтва. Унутраныя вокны кампартыментаў-келляў на хорах Спаса-Праабражэнскага храма выходзяць акурат на фрэскавыя выявы стоўпнікаў у дыяканніку і ахвярніку. І гэта нездарма. Архітэктурна-археалагічныя даследаванні паўночнага кампартымента паказалі, што ў гэтым памяшканні былі два паверхі. У ніжнім знаходзіўся скрыпторый і, магчыма, бібліятэка, а верхняе, на якое трэба было забірацца пры дапамозе лесвіцы, было местам малітвы ў адзіноце, якой нішто не перашкаджала[6].

---

[5] Калечыц, І. Л. Палеаграфічная спадчына полацкай Спаса- Праабражэнскай царквы: суправаджальныя надпісы на фрэсках і праблема аўтарства / І. Л. Калечыц. – Мінск : Беларуская навука, 2025. – 135 с.: іл.

[6] Зыков, П. Л. Исследование северного помещения на хорах Спасской церкви Евфросиньева монастыря в Полоцке / П. Л. Зыков, Е. Н. Торшин // Гісторыя і археалогія Полацка і





*Илл. 10.* **Северный компартимент хор Спасской церкви**
**Евфросиньева монастыря в Полоцке**
*Деревянные конструкції XII в. Продольный разрез с видом на юг*
*Реконструкция П. Зыкова*

**Паўночны кампартымент полацкай Спаса-Праабражэнскай царквы.**

Знешні выгляд і рэканструкцыя

Прападобная Еўфрасіння кіравала дзейнасцю двух манастыроў. Акрамя гэтага адміністратыўнага кіравання на ёй было і духоўнае выхаванне сясцёр манастыра, настаўніцтва і кіраўніцтва іх духоўным жыццём. Акрамя гэтага, прападобная ўвяла ў Полацку традыцыю, подобную да канстанцінопальскай, нашэння па полацкіх цэрквах абраза Багародзіцы Адзігітрыі, атрыманай ёй для Багародзіцкага храма[7].

Пра дыпламатычную дзейнасць прападобнай Еўфрасінні сведчаць высокаякасныя помнікі сфрагістыкі, актавыя пячаткі, две з якіх былі знойдзены падчас археалагічных даследаванняў Спаса-Праабражэнскага храма. Князі і епіскапы, канстантынопальскі патрыярх і візантыйскі імператар – тыя адрасаты, з якімі мела перапіску прападобная.

---

Полацкай зямлі : матэрыялы VII Міжнароднай навуковай канферэнцыі (Полацк, 1—2 лістапада 2017 г.) / [укладальнік Т. У. Явіч]. – Полацк, 2019. – С. 93–108.

[7] Кніга жыцій…, с. 52.



**Актавыя пячаткі прападобнай Еўфрасінні Полацкай**

Апошняя справа святой – вандроўка ў святую зямлю ў старэчым узросце – сведчыць пра фізічную і духоўную крэпасць прападобнай. Яе адыход у вечнасць, які яна свядома папрасіла для сябе ў Бога, таксама паказчык яе духоўнай моцы.

Усё жыццё прападобнай Еўфрасінні – гэта прыклад спалучэння пакоры і вышыні, мудрасці і свядомасці. Яна ведала моц сваёй натуры. У “Жыцці” для перадачы гэтага выкарыстоўваюцца словы “мужчынская моц”[8], “нежаночая сіла”[9]. Яна выкарыстоўвала яе цалкам пры жыцці. Прападобная Еўфрасіння працягвае быць прыкладам і аб’ядноўвае людзей пасля смерці, дапамагае ім. Гэта нагода для захаплення і добры прыклад таго, як можна выкарыстаць свой патэнцыял, які, безумоўна, ёсць у кожнага з нас.

## Спіс выкарыстанай літаратуры


1. Зыков, П. Л. Исследование северного помещения на хорах Спасской церкви Евфросиньева монастыря в Полоцке / П. Л. Зыков, Е. Н. Торшин // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі : матэрыялы VII Міжнароднай навуковай канферэнцыі (Полацк, 1—2 лістапада 2017 г.) / [укладальнік Т. У. Явіч]. – Полацк, 2019. – С. 93–108.
2. Калечыц, І. Л. Палеаграфічная спадчына полацкай Спаса-Праабражэнскай царквы: суправаджальныя надпісы на фрэсках і


[8] Там жа, с. 44
[9] Там жа, с. 54

праблема аўтарства / І. Л. Калечыц. – Мінск : Беларуская навука, 2025. – 135 с.: іл.

3. Кніга жыцій і хаджэнняў: Пер. са старажытнарус., старабеларус. і польск. / Уклад., прад. і каментарыі А. Мельнікава. – Мн.: Маст. літ., 1994. – 503 с.
4. Сарабьянов, В. Д. Мир книжности в росписях Спасской церкви Евфросиньевского монастыря / В. Д. Сарабьянов // Выступление Сарабьянова Владимира Дмитриевича, кандидата искусствоведения, главного искусствоведа, бригадира художников-реставраторов Межобластного научно-реставрационного художественного управления (г. Москва) с докладом «Мир книжности в росписях Спасской церкви Евфросиньевского монастыря. К вопросу о просветительской деятельности преп. Евфросинии Полоцкой» на конференции «История и археология Полоцка и Полоцкой земли» 1-3 ноября 2012 г. [Электронный ресурс] – Режим доступа: https://www.youtube.com/watch?v= MI0t8jcqA3c. – Дата доступа: 02.04.2024